Грыбко І. Л. Гарадскія выбарчыя сходы на Беларусі ў 70-90-я гг. XIX ст. / І. Л. Грыбко // Працы гістарычнага факультэта БДУ: навук. зб. Вып. 2 / рэдкал. У. К. Коршук (адк. рэд.) [і інш.] – Мн: БДУ, 2007. – С. 109–114

**І. Л. ГРЫБКО**

# ГАРАДСКІЯ ВЫБАРЧЫЯ СХОДЫ НА БЕЛАРУСІ Ў 70—90-я гг. XIX ст.

У рэфармаванні грамадскага жыцця і развіцці буржуазных адносін урадавая палітыка Аляксандра II надавала вялікае значэнне гарадам. Аднак у гарадах панавала саслоўнае кіраванне, а існуючыя муніцыпальныя ўстано-



вы былі бяспраўнымі і недзеяздольнымі. Хуткі рост гарадскога насельніцтва, ускладненне муніцыпальнай гаспадаркі патрабавалі карэнных змяненняў сістэмы грамадскага кіравання. Урэшце, пасля працяглай падрыхтоўкі ў чэрвені 1870 г. было прынята новае Гарадавое палажэнне. Рэформа хоць і не спраўдзіла ўсіх спадзяванняў грамадства, але, безумоўна, з’явілася значным прагрэсіўным крокам адносна ранейшых заканадаўчых норм.

Паводле новага заканадаўства сістэма самакіравання складалася з выбарчага сходу, гарадской думы і гарадской управы. Распарадчыя функцыі належалі думе, а выканаўчыя — управе. Гласныя думы выбіраліся выбарчымі сходамі на чатырохгадовы тэрмін. Колькасць гласных думы вагалася ад 30 да 72 чалавек, у залежнасці ад колькасці выбаршчыкаў.

Права ўдзельнічаць у выбарах атрымалі рускія падданыя мужчынскага полу, якія дасягнулі 25-гадовага ўзросту і валодалі ў межах горада нерухомай маёмасцю ці гандлёвымі або прамысловымі прадпрыемствамі, з якіх выплачваліся падаткі ў гарадскі бюджэт. Акрамя таго, выбарчым правам пры дадатковай умове — двухгадовым цэнзе аселасці — надзяляліся ўладальнікі прыказчыцкіх пасведчанняў першага разраду, купецкіх або прамысловых пасведчанняў на дробны гандаль ці білетаў на ўтрыманне прамысловых устаноў [1]. Новае палажэнне грунтавалася на буржуазных прававых нормах: усесаслоўнасці прадстаўніцтва, маёмасным выбарчым цэнзе, прынцыпах самакіравання, падзеле распарадчай і выканаўчай улады.

Гарадавое палажэнне 1870 г. уводзілася паступова. Першапачаткова да новай сістэмы кіравання перайшлі гарады ўнутраных расейскіх губерняў, Сібіры і Бесарабіі. На Беларусі рэформа пачалася ў 1875 г. паводле закона «Аб прымяненні Гарадавога палажэння 16 чэрвеня 1870 года да гарадоў Заходніх губерняў». Засцерагаючыся апазіцыйнасці мясцовага дваранства і буржуазіі, урад вельмі асцярожна ставіўся да ўвядзення самакіравання ў заходніх губернях. Таму рэформа тут ажыццяўлялася «паступова, па бліжэйшых мясцовых меркаваннях» і з асабістага дазволу міністра ўнутраных спраў адносна кожнага горада [2].

Спачатку на новае палажэнне пераводзіліся толькі губернскія гарады і па адным з павятовых гарадоў у кожнай губерні. Пасля атрымання дазволу на рэформу мясцовыя ўлады распачыналі падрыхтоўчую працу. На першым этапе найбольшыя складанасці выклікалі вылучэнне спіса выбаршчыкаў і правядзенне выбарчых сходаў. Улічваючы адсутнасць папярэдняй практыкі ў гэтым пытанні, у Гарадавое палажэнне быў уключаны асобны раздзел «Аб гарадскіх выбарчых сходах». Раздзел змяшчаў 32 артыкулы і падрабязна вызначаў умовы атрымання актыўнага і пасіўнага выбарчага права, характар выбарчай сістэмы, парадак вызначэння спісаў выбаршчыкаў, падачу скаргаў і г. д.



Згодна з заканадаўствам, выбарчыя сходы склікаліся выключна для абрання гласных гарадской думы і збіраліся праз кожныя чатыры гады. Падрыхтоўка выбарчых сходаў пачыналася са складання спіса тых, хто атрымаў права ўдзельнічаць у гарадскім самакіраванні. Паколькі выбарчае права атрымалі толькі ўладальнікі нерухомай маёмасці і гандлёва-прамысловая буржуазія, то большая частка гараджан у выбарах не ўдзельнічала. Выбарчага права былі пазбаўлены хатняя прыслуга, наёмныя рабочыя, уладальнікі пасведчанняў на мяшчанскія промыслы, а таксама кватэранаймальнікі, да якіх у большасці адносіліся чыноўнікі і інтэлігенцыя.

Колькасць выбаршчыкаў была адносна невялікай ва ўсіх гарадах. Але сярэдні працэнт выбаршчыкаў быў вышэйшым у павятовых гарадах, дзе большая частка насельніцтва пражывала ва ўласных дамах, і ніжэйшым у губернскіх гарадах. У час увядзення новага заканадаўства ў Віцебску выбаршчыкі складалі ўсяго 4,2 % агульнай колькасці жыхароў, а ў Полацку — звыш 8 % [3]. Падобная карціна назіралася і ў іншых губернях. Цікава адзначыць, што з ростам гарадскога насельніцтва колькасць выбаршчыкаў заставалася амаль нязменнай. У большасці гарады павялічваліся за кошт сялянства і іншых маламаёмных сацыяльных слаёў,

таму на колькасць выбаршчыкаў гэта значна не ўплывала. Так, за дванаццаць гадоў пасля ўвядзення Гарадавога палажэння насельніцтва Віцебска павялічылася амаль на 17 тыс. чалавек, а колькасць выбаршчыкаў з 1513 чалавек у 1876 г. змянілася да 1507 чалавек у 1888 г. [4] Адначасова доля выбаршчыкаў адносна насельніцтва горада зменшылася і складала ўжо толькі каля 3 %.

Пасля вылучэння спіса патэнцыяльных выбаршчыкаў неабходна было падзяліць спіс на разрады. Засцерагаючыся дэмакратычнасці ўсесаслоўнага самакіравання, урад імкнуўся забяспечыць перавагу прадстаўніцтва найбольш заможных колаў насельніцтва. Гэтаму садзейнічала створаная па прускім ўзоры так званая трохразрадная выбарчая сістэма. Паводле 24-га артыкула Гарадавога палажэння ўсе выбаршчыкі ў залежнасці ад велічыні збораў у гарадскі бюджэт падзяляліся на тры выбарчыя сходы, або разрады. Да першага адносілася невялікая група буйных падаткаплацельшчыкаў, якія плацілі трэць агульнай сумы гарадскіх збораў, да другога — наступныя па спісе, сярэднія плацельшчыкі, яны ўносілі таксама адну трэць падаткаў, трэці разрад складалі астатнія дробныя плацельшчыкі. Так, падчас выбараў 1888 г. у Віцебску вышэйшы збор у гарадскую казну ў першым разрадзе складаў 731 руб. 20 кап., у другім разрадзе — 95 руб. 25 кап., а спіс трэцяга разраду пачыналі падаткаплацельшчыкі, якія ўносілі 17 руб. 25 кап. [5] Ніжэйшы збор у гарадскі бюджэт зафіксаваны ў памеры 3 руб. 20 кап., а ўносілі такія плацяжы 129 віцяблян [6]. Сума агульнага плацяжу з кожнага разраду раўнялася прыкладна 7980 руб.[7] Зразумела, што ў трэцім разрадзе гэтая сума складалася з



вялікай колькасці дробных плацяжоў. Нягледзячы на розную колькасць удзельнікаў, кожны выбарчы сход ад свайго разраду абіраў трэць гласных думы.

Выбарчыя сходы першага разраду ва ўсіх гарадах былі нешматлікімі. У час увядзення Гарадавога палажэння ў Віцебску выбарчы сход першага разраду налічваў 38 чалавек, другога — 150, трэцяга 1325, а ў Полацку — адпаведна разрадам — 22, 114 і 946 чалавек [8]. Відавочна, што прадстаўніцтва ад першых двух разрадаў было значна вышэйшым, бо кожны сход выбіраў роўную колькасць гласных. Згодна з 41-м артыкулам Гарадавога палажэння, выбарчы сход лічыўся дзеяздольным, калі колькасць выбаршчыкаў перавышала колькасць гласных, якіх патрэбна было выбраць ад гэтага разраду. На практыцы ў невялікіх гарадах нярэдка колькасць выбаршчыкаў першага разраду была меншай за колькасць гласных, якіх належала абраць. Падобнае становішча склалася ў 1879 г. у Вілейцы, дзе з 318 гарадскіх выбаршчыкаў да першага разраду адносілася толькі 9 чалавек (2 хрысціяніна і 7 іўдзеяў). Яны ўносілі трэць гарадскіх збораў — 136 рублёў з агульнай сумы 395 рублёў — і павінны былі абраць 10 гласных, што складала трэць думы [9]. Міністэрства ўнутраных спраў вымушана было дазволіць падзяліць выбаршчыкаў толькі на два сходы, далучыўшы да першага разраду найбольш заможных плацельшчыкаў горада. Але і выбары на наступны тэрмін вялікіх змяненняў не прынеслі. У 1888 г. у выбарчыя спісы Вілейкі былі ўключаны 442 чалавекі. Пры падзеле спіса на тры разрады ў першым налічвалася толькі 8 выбаршчыкаў, а пры падзеле спіса на два разрады — да першага адносілася ўсяго 18 выбаршчыкаў. Пасля дэталёвага вывучэння ўсіх матэрыялаў Міністэрства ўнутраных спраў прапанавала падзяліць выбаршчыкаў горада на два разрады, пры гэтым у першы ўключыць да 34 буйнейшых падаткаплацельшчыкаў [10]. Нягледзячы на тое, што Гарадавое палажэнне ў артыкуле 25 дапускала магчымасць «пры малалікасці выбаршчыкаў» стварыць замест трох два разрады, Міністэрства ўнутраных спраў рабіла гэта неахвотна і толькі ў асаблівых выпадках.

Абавязковай умовай удзелу ў выбарах быў своечасовы разлік па гарадскіх плацяжах. Асобы, якія не плацілі ў гарадскі бюджэт, выключаліся з выбарчых спісаў. У 1884 г. віцебскі губернатар паведаміў у МУС аб становішчы ў Дынабургу, дзе частка выбаршчыкаў не ўнесла своечасова гарадскія зборы і была пазбаўлена выбарчага права. У выніку ў першым выбарчым сходзе засталося 12 чалавек, у другім — 56, у трэцім — 648 [11]. А кожнаму сходу належала абраць па 14 гласных думы. Агульная колькасць выбаршчыкаў Дынабурга ў параўнанні з 1876 г. зменшылася больш чым у 1,5 раза.

Пасля вылучэння асоб, якія мелі выбарчае права, і падзелу спіса на разрады надыходзіў наступны этап падрыхтоўкі выбарчых сходаў. Заканадаў-



ства патрабавала азнаямлення насельніцтва са спісам выбаршчыкаў. Звычайна гарадскія ўлады не мелі сродкаў надрукаваць спісы і выстаўлялі для агульнага азнаямлення адзінкавы рукапісны экземпляр. У сакавіку 1880 г. гомельская дума зацвердзіла наступны спосаб абвяшчэння спісаў: выставіць у прыметных месцах горада абʼявы аб тым, што выбарчыя спісы будуць знаходзіцца ў памяшканні гарадской управы. Абывацеляў запрашалі на працягу двух тыдняў у вызначаны час з 10 да 14 гадзін наведаць управу і азнаёміцца са спісамі, а ў выпадку нязгоды — падаць скаргі [12]. Гэта было вельмі нязручна і не выклікала

вялікай актыўнасці сярод жыхароў. Да таго ж арыентавацца ў выстаўленых рукапісных лістах было няпроста. У спісе былі паказаны толькі прозвішчы выбаршчыкаў, якія размяшчаліся не ў алфавітным парадку, а ў залежнасці ад памеру падатку ў гарадскі бюджэт. Падобная практыка існавала ў Полацку і іншых гарадах.

Пасля разгляду скаргаў спісы зацвярджаліся і ўжо вызначаліся даты правядзення выбарчых сходаў. Звычайна выбары ў гарадскую думу прызначаліся асобна па разрадах і займалі некалькі дзён. Так, першыя выбары па новым заканадаўстве ў Магілёве адбыліся 7, 8 і 12 студзеня 1876 г. Пры вызначэнні даты выбараў трэба было ўлічваць як рэлігійныя святы — праваслаўныя, каталіцкія і іўдзейскія, так і мясцовыя асаблівасці. Так, у 1881 г. віленскі губернатар паведамляў у МУС аб немагчымасці ў хуткім часе правесці выбарчыя сходы ў Вілейцы, «таму што з пачаткам вясны да 2/3 наяўнай колькасці выбаршчыкаў з мяшчан-хрысціян г. Вілейкі знаходзяцца ў атлучцы, займаясь сплавам лесу, што працягваецца да восені»[13].

Заканадаўства не абмяжоўвала колькасць кандыдатур для галасавання. У час выбараў у другім выбарчым сходзе Гомеля ў 1884 г. для балаціроўкі было прапанавана 78 кандыдатаў, якія прэтэндавалі на 24 месцы гласных думы [14]. Працэдура выбараў займала шмат часу. Паколькі скрынь не хапала, каб прагаласаваць за кожнага з кандыдатаў, выбаршчык павінен быў абысці ўсе скрыні некалькі разоў. Прычым кожны раз трэба было чакаць выніку падлікаў шароў. Нярэдка для ўдзелу ў абранні гласных думы выбаршчыку патрэбна было адвесці цэлы дзень, а ў шматлікіх сходах нават два дні. Так, у 1884 г. выбары па трэцім разрадзе ў Полацку праходзілі 13 і 17 лютага, таксама двойчы збіраўся выбарчы сход другога разраду ў Гомелі — 31 кастрычніка і 1 лістапада 1884 г. Не ўсе гараджане маглі сабе гэта дазволіць, і таму частка выбаршчыкаў не прыходзіла на сход або перадавала свае галасы па даверанасці, што не забаранялася законам. Быць абранымі гласнымі думы (пасіўнае выбарчае права) мелі ўсе асобы, дапушчаныя да ўдзелу ў выбарчым сходзе, у тым ліку і тыя, хто атрымаў актыўнае выбарчае права па даверанасці.



Трохразрадная выбарчая сістэма мела шэраг недахопаў і ўжо ў час свайго існавання выклікала шмат крытыкі і нараканняў з боку грамадства. Найбольш значнай адмоўнай рысай гэтай сістэмы выступала няроўнае прадстаўніцтва выбарчых сходаў або разрадаў у думе. Наступнае Гарадавое палажэнне, прынятае ў 1892 г., адмяніла падзел выбаршчыкаў на разрады, але адначасова значна павялічыла маёмасны цэнз, што выключыла дробных плацельшчыкаў з грамадскага кіравання.

1 Городовое положение с объяснениями. 2-е изд. СПб., 1873. С. 20—21.

2 Городовое положение со всеми относящимися к нему узаконениями, судебными и правительственными разъяснениями. СПб., 1886. С. 389.

3 Грыбко І. Л. Рэфармаванне гарадскога кіравання Беларусі ў 70—80-я гг. XIX ст. // Гістарычная навука ў Белдзяржуніверсітэце на рубяжы тысячагоддзяў: матэрыялы Рэсп. навук.-практ. канф., прысвеч. 65-годдзю заснавання гістарычнага факультэта Белдзяржуніверсітэта. 26 лістап. 1999 г. Мінск. Мн., 2000. С. 92.

4 Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей — НГАБ). Ф. 2496. Воп. 1. Спр. 1844. Арк. 3, 17.

5 Там жа. Арк. 1, 3, 17.

6 Там жа. Спр. 1846. Арк. 79—86.

7 Там жа. Спр. 1844. Арк. 3, 17.

8 Брыгадзін П., Грыбко І. Аляксандр II: «Тэрмінова прыступіць да паляпшэння грамадскага кіравання...» // Беларус. мінуўшчына. 1996. № 2. С. 14.

9 Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў (далей — РДГА). Ф. 1287. Воп. 38. Спр. 1784. Арк. 69.

10 Там жа. Арк. 332, 343.

11 Там жа. Спр. 1727. Арк. 32—33.

12 НГАБ. Ф. 2912. Воп. 1. Спр. 18. Арк. 17.

13 РДГА. Ф. 1287. Воп. 38. Спр. 1755. Арк. 227.

14 НГАБ. Ф. 2100. Воп. 1. Спр. 2. Арк. 55.